ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 08 2018 г.

Нябачныя масты

ВОСЬ ГЭТА «ЗАМЕС»!

Хто дапамагае будаваць студгарадок у Мінску

Чым беларуская сталіца можа завабіць піцерцаў? Архітэктурай, гісторыяй, нізкімі цэнамі? Маладзёжнай будоўляй! З 15 ліпеня да 25 жніўня хлопцы і дзяўчаты з Санкт-Пецярбурга ў складзе беларуска-расійскага атрада дапамагаюць узводзіць інтэрнат у Студэнцкай вёсцы. Мы завіталі туды ў разгар працоўнага дня і даведаліся, што стамляе байцоў больш за афарбоўку сцен і вынас смецця, і чым ім запомніўся Мінск.

...На дварэ спякота. А на будоўлі з васьмі раніцы кіпіць работа. Студэнтам даручаюць заданні, якія не патрабуюць кваліфікацыі: пераносіць блокі, тынкаваць сцены, выграбаць пясок.

У складзе расійскага будатрада 15 студэнтаў. За камандзіра — Мікіта Бяльдзянаў, чацвёртакурснік Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Да цяжкай фізічнай работы ён звыклы.

— Дзякуй бацьку і дзеду, навучылі. У нас на лецішчы бясконцая будоўля, — усміхаецца студэнт. — Фізічная праца мне больш па душы, чым з дзецьмі вазіцца, як у педагагічным атрадзе. Дый будаўнікі ў фінансавым плане выйграюць. Нам абяцалі ў сярэднім 25 тысяч расійскіх рублёў (ці каля 800 беларускіх рублёў. — **Аўт.**) за месяц.

Для Мікіты час за работай пралятае незаўважна. Да спякоты, кажа, прывык, тым больш у Піцеры зараз тэмпература вышэйшая. А вось да беларускай вільготнасці трэба яшчэ адаптавацца.

Арцём Баляеў вучыцца ў Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным архітэктурна-будаўнічым універсітэце. Пасля лекцый часам падпрацоўвае — робіць будаўнічыя праекты для падрадных арганізацый. Атрымае дыплом — будзе прарабам ці праекціроўшчыкам. А пакуль шчыруе рознарабочым.

Для расійскіх студэнтаў, большасць якіх у Беларусі ўпершыню, БРСМ арганізаваў бясплатныя экскурсіі па сталіцы. Моладзі паказуць Нацыянальны мастацкі музей, Мінскі трактарны завод, кандытарскую фабрыку «Камунарка», музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Байцы ўжо паспелі пабываць у аквапарку «Лебядзіны».

— Я сама з Краснадарскага краю, таму ведаю, якія яны бываюць, і, калі паглядзела ваш, была прыемна ўражана, — дзеліцца Паліна Кажура, другакурсніца Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

Паліна — адна з трох дзяўчат у атрадзе. Будучы менеджар у сферы турызму планавала правесці гэта лета ў Крыме ці Сочы — у складзе сэрвіснага атрада. Працавала б кухарам, афіцыянткай ці аніматарам. Але не склалася, і трэба было тэрмінова шукаць альтэрнатыву.

— Не пашкадавала ні кроплі, што апынулася тут. Сама ў дзяцінстве з бацькамі дом будавала, таму ведаю, як шпакляваць і тынкаваць. Але дзяўчатам тут складаную работу не даюць, стараюцца нас моцна не перагружаць. Мы фарбавалі, падмяталі, але пераважна працуем з дакументацыяй.

Дзяўчаты з самага пачатку склалі план, куды пайсці ў Мінску. Прагуляліся па цэнтры, паглядзелі стадыён «Дынама», бо прачыталі, што яго нядаўна рэканструявалі. Паліне спадабалася ў раёне Нямігі.

— На будаўнічым аб'екце не стамляемся. Цяжэй дома (байцы жывуць у студэнцкім інтэрнаце. — **Аўт.**), калі трэба накарміць хлопцаў. Што гатуем? Мы ж ехалі ў Беларусь, таму бульбу, — жартуе Паліна. — Супчыкі варым. У вас тушонка вельмі смачная — пастаянна ядзім яе з грэчкай, макаронай. Карацей, стандартнае паходнае меню.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Дзяўчаты добра гатуюць, малайчыны, — хваліць гаспадынь Аляксей Дудараў, студэнт з Архангельска, які воляй лёсу таксама трапіў у гэты атрад.

Лёша вывучае сацыяльную работу ў Паўночным (Арктычным) федэральным універсітэце імя Ламаносава. Тры гады працаваў у будатрадзе «Мядзведзь» — на касмадроме «Усходні», на аб'ектах Мінабароны ў Североморску, у прэзідэнцкім кадэцкім вучылішчы ў Петразаводску.

Прызнаецца, што ў студгарадку працаваць не складана. Калі на іншых будоўлях быў дзесяцігадзінны рабочы дзень, то тут — васьмігадзінны. І два выхадныя, а не адзін.

Заробленыя за лета грошы Лёша траціў па-рознаму. Купіў камп'ютар, тэлефон, адкладваў на кішэнныя расходы на год, каб у бацькоў не прасіць. А сёлета хацеў бы з'ездзіць куды-небудзь адпачыць.

Хлопец любіць падарожнічаць, таму яму цікава было паглядзець Беларусь. «Шкада, што ў Мінску мала гістарычных аб'ектаў, але, я так разумею, гэта звязана з тым, што горад быў цалкам разбураны ў гады вайны. Здзівіла мінскае метро — усяго дзве веткі. Пасля Масквы і Пецярбурга гэта нязвыкла».

Будучы інжынер-аўтаматызатар Канстанцін Цярэнцьеў, калі ехаў сюды, ведаў, што Мінск — горад чысціні і прыемных людзей.

— Што кідаецца ў вочы? Адчуваецца дух СССР. У вас прадукты больш танныя. Архітэктура цудоўная, я ніколі не бачыў будынкаў такіх формаў. Людзі адкрытыя — у Піцеры больш недаверлівыя. Карацей, мне вельмі падабаецца горад. Я, магчыма б, нават тут застаўся, калі б не вучоба, — кажа хлопец.

Таму, што трапіў у будатрад, студэнт Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага марскога тэхнічнага ўніверсітэта рады.

За свае 25 тысяч рублёў, заробленыя за змену, Косця хоча купіць гітару. «Паглядзім, спачатку трэба іх атрымаць, а ўжо потым распараджацца бюджэтам», — разважае ён.

На тое, што дзеля работы ў атрадзе давялося ахвяраваць адпачынкам, ніхто з байцоў не паскардзіўся. «Мы і тут адпачываем, тым больш у такой добрай кампаніі», — смяюцца хлопцы і дзяўчаты.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

КАМУ ПА СІЛАХ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Усе будучыя важатыя праходзяць праз спецыялізаванае навучанне. Пачынаецца яно задоўга да лета — у снежні — студзені, і ўключае ў сябе пяць этапаў. Першы з іх — гэта гутарка. Перавага на ёй аддаецца адкрытай, матываванай, шчырай моладзі. Дапамагае ў адборы кваліфікаваны псіхолаг.

Пасля гутаркі кандыдаты ў важатыя дзеляцца на мікрагрупы, за імі замацоўваюцца куратары, якія даюць заданні на выхад з зоны камфорту, праверку прафесійнай прыдатнасці, псіхалагічную сумяшчальнасць. Такая работа доўжыцца каля трох тыдняў. Тыя, хто на гэтым этапе не адсеяўся, пераходзяць да вочнага навучання. Яно шмат у чым падобнае да класічных універсітэцкіх заняткаў, але асноўны ўпор зроблены на семінары і трэнінгі. Пасля ідзе практыка. Шматлікія мерапрыемствы, якія праходзяць у рамках лагера, размяркоўваюцца паміж навучэнцамі і «прайграюцца». Бо калі будзе прабел у ведах, то давядзецца экстранна выпраўляць сітуацыю ўжо на месцы, а кантакт «важаты — дзеці» рызыкуе быць парушаны. І «вішанька на торце» — выязное навучанне непасрэдна ў лагеры. За тры дні будучыя важатыя мадэлююць усе магчымыя сітуацыі — заезд, рассяленне, кантакты з бацькамі, вячэрнія «свечкі»-зборы, дзе члены атрада абмяркоўваюць адзін аднаго. З 280 чалавек, якія пачыналі вучобу, навучанне паспяхова скончылі толькі 200.

Кацярына Макарава працуе важатай у атрадзе «Ветразь» ужо другі год, яна скончыла другі курс БДПУ. Вучыцца дзяўчына на факультэце дашкольнай адукацыі. Пад яе кіраўніцтвам — дынастыя «Бурбоны».

— Мае выхаванцы — дзеці ва ўзросце 13-14 гадоў. Той самы пераходны ўзрост — гіперактыўнасць і непаслухмянасць, праз што праходзілі ўсе мы, — смяецца Кацярына. — Самае складанае — сказаць падлеткам, што ўжо 22.30 і надышоў час адбою пасля дыскатэкі. А раніцай усе хочуць больш паспаць. Па першым часе яшчэ ёсць «жаваранкі», якія ўстаюць а 6-й гадзіне і нават раней, але пасля яны падстройваюцца пад іншых.

Дзень у важатага складаны. Ён пачынаецца ў 7 раніцы, а заканчваецца... Скажам так, дакладнай часавай мяжы ўвечары няма. Пад'ём у дзяцей — у 7.40. Разам з імі важатыя ідуць на зарадку, сняданак. Да абеду — гульні на свежым паветры: валейбол, піянербол, футбол, баскетбол... А яшчэ ідзе падрыхтоўка да самых разнастайных мерапрыемстваў. Напрыклад, у лагеры прайшла «Ноч музеяў». Кожная «дынастыя» прадстаўляла некалькі экспазіцый, якія ў пэўны момант ажывалі. Падчас «Легендаў музыкі» дзеці выступалі на балконах і спявалі легендарныя кампазіцыі Queen, Led Zeppelin, Beatles... Па мастацкай кнізе здымаем двухвілінны буктрэйлер. А яшчэ прайшоў Дзень Гары Потэра, калі па лагеры бегалі 240 маленькіх чараўнікоў. Была і «Хвіліна славы», дзе кожны мог паказаць свае здольнасці.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Першыя тры дні, як правіла, дзеці прывыкаюць адзін да аднаго. Ім крыху складана звыкнуцца і з рэжымам дня, бо звычайна яны не праводзяць столькі часу на свежым паветры. Мабільныя тэлефоны выдаюцца толькі на «ціхай гадзіне», бо актыўны адпачынак не мусіць ператварацца ў «сядзенне ў смартфоне» пад дрэвамі.

А вось бацькі з дапамогай гаджэтаў могуць сачыць за тым, як іх дзеці пачуваюць сябе ў лагеры. Фота са шматлікіх імпрэз аператыўна выкладваюцца ў сацыяльных сетках.

Цікаўлюся ў Кацярыны Макаравай, што ж яе натхніла на такую цікавую, але даволі складаную працу.

— Дзеці — гэта закрытая кніга, якую хочацца раскрыць і пакінуць у ёй добры след. Малыя ж памятаюць свайго першага настаўніка, выхавацельку ў дзіцячым садзе... Быць для кагосьці прыкладам — гэта гонар для мяне.

А наколькі складана самім важатым працаваць учацвярых?

— Сярод нас ідзе раздзяленне паўнамоцтваў. Абавязкаў вельмі шмат: прыбраць у сталовай, накрыць стол, адвесці дзяцей на працэдуры, на спаборніцтвы па футболе, майстар-класы, прыдумаць праграму мерапрыемстваў... Да таго ж мы адмовіліся ад ідэі прапаноўваць мерапрыемствы дзецям «зверху», а прыдумляем іх разам. У нас няма паняцця «гурткавая работа», мы перайшлі на фармат майстар-класаў. Самы папулярны кірунак — танцы. Карыстаецца попытам і хэнд-мэйд, пачынаючы ад выбару чахлоў на тэлефоны і заканчваючы аплікацыямі ў 3D. Тыя, хто ўмее спяваць, рыхтуюцца да конкурсу па фармаце, падобным на «Еўрабачанне». Шмат падлеткаў задзейнічаны на сілавой аэробіцы. Адным словам, занятак па душы мы знойдзем кожнаму.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.